# ФІЛАЛОГІЯ

## МОВАЗНАЎСТВА

Весці БДПУ. Серыя 1. 2025. № 2. С. 64–67

*УДК 811.161.3’373*

### *«І МАЯ КРЫНІЧКА ЦЯКЛА ПРАЗ МІЛЬЯРДЫ ГАДОЎ НЯСТРЫМНА...»:* КАТЭГОРЫІ ТЭМПАРАЛЬНАСЦІ І ЭКЗІСТЭНЦЫЯЛЬНАСЦІ Ў ПАЭТЫЧНЫМ ДЫСКУРСЕ ВАСІЛЯ ЗУЁНКА

**В. Д. Старычонак,**
*доктар філалагічных навук, прафесар,*
*дэкан філалагічнага факультэта*
*Беларускага дзяржаўнага педагагічнага*
*ўніверсітэта імя Максіма Танка*
*ORCID: https://orcid.org/0009-0002-4469-8802*

Паступіў у рэдакцыю 16.04.2025.

*UDC 811.161.3’373*

### *“AND MY SPRING FLOWED UNCONTAINEDLY THROUGH BILLIONS OF YEARS...”:* CATEGORIES OF TEMPORALITY AND EXISTENTIALITY IN THE POETIC DISCOURSE OF VASIL ZUYENOK

**V. Starychonok,**
*Doctor of Philology, Professor,*
*Dean of the Philological Faculty*
*of the Belarusian State Pedagogical*
*University named after Maxim Tank*
*ORCID: https://orcid.org/0009-0002-4469-8802*

Received on 16.04.2025.

Артыкул прысвечаны тэмпаральным і экзістэнцыяльным намінацыям у паэтычным дыскурсе вядомага беларускага пісьменніка Васіля Зуёнка. Разглядаецца тэмпаральны кантынуум, які ўключае спалучэнні назоўнікаў *час*, *год*, *век* з прадметнымі намінацыямі розных сэнсавых сфер. У эпіцэнтры аўтарскага разважання звычайна знаходзяцца тры перыяды: мінулае, цяперашняе і будучае. Асаблівая ўвага надаецца рэпрэзентацыі самай светлай пары жыцця чалавека – яго дзяцінства. Аналізуюцца шматлікія метафарычныя кантэксты, у якіх сімвалізуецца жыццёвы шлях чалавека, яго лёс і прызначэнне, роля ў жыцці грамадства. Прыводзяцца розныя дэфініцыі субстантыва *жыццё*, якое можа атаясамлівацца практычна з неабмежаванай колькасцю з’яў і рэалій навакольнай рэчаіснасці. Адзначаецца цесная сувязь паняццяў *жыццё* і *смерць*, якія ў адных выпадках проціпастаўляюцца, у другіх – атаясамліваюцца і разглядаюцца як адзіныя часткі складанага экзістэнцыяльнага працэсу.

*Ключавыя словы*: паэзія, дыскурс, намінацыя, метафара, кантэкст, экзістэнцыяльнасць, тэмпаральнасць.

The article is devoted to temporal and existential nominations in the poetic discourse of the famous Belarusian writer Vasil Zuyenok. The temporal continuum is considered, which includes combinations of the nouns *time*, *year*, *century* with subject nominations of various semantic spheres. At the epicenter of the author’s reasoning are usually three periods: past, present and future. Special attention is paid to the representation of the brightest period of a person’s life – his childhood. Multiple metaphorical contexts are analyzed, in which the life path of a person, their fate and destiny, their role in the life of society are symbolized. Various definitions of the noun *life* are given, which can be identified with an almost unlimited number of phenomena and aspects of the surrounding reality. The close connection between the concepts *life* and *death* is noted, which in some cases are opposed, in other cases are identified with each other and are considered as singular parts of a complex existential process.

*Keywords:* poetry, discourse, nomination, metaphor, context, existentiality, temporality.

3 чэрвеня спаўняецца 90 гадоў з дня нараджэння вядомага беларускага паэта, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Янкі Купалы, аўтара вядомых паэтычных твораў, празаічных элегій, эсэ, эцюдаў, твораў для дзяцей, літаратурна-крытычных артыкулаў Васіля Зуёнка. У творах усіх жанраў пісьменнік выяўляе сябе не толькі як паэт-лірык, але лірык з эпічным светабачаннем [1, с. 12]. Мастацкі свет паэта, як адзначаюць многія даследчыкі яго творчасці [2–5], уключае шырокі духоўны дыяпазон, моўную інтуіцыю, жыццялюбства, пяшчотны лірызм, эмацыянальную напружанасць і сэнсавую глыбіннасць кантэксту, судакрананне шырокага і недасягальнага абсягу космасу з кожнай драбінкай жыцця чалавека.

Адной з вызначальных рыс паэтычнага дыскурса В. Зуёнка з’яўляецца адлюстраванне жыцця чалавека ў яго шматлікіх экзістэнцыяльных і тэмпаральных вымярэннях. Аўтар смела рэалізуе закладзены ў слове семантычны патэнцыял і выкарыстоўвае неабходныя і актуальныя ў пэўнай сітуацыі значэнні, адценні слова і нетрадыцыйныя асацыятыўна-вобразныя падабенствы, якія дазваляюць зрокава ўявіць скрытыя і нябачныя ўяўленні пра неабсяжны і непаўторны свет чалавека.

Зуёнкаўскія тэмпаральныя намінацыі (лац. *tempus*, *temporis* ‘час’) адлюстроўваюць працягласць існавання ўсіх з’яў рэчаіснасці, паслядоўнасць змен іх станаў. Час у паэта не абстрактны і ізаляваны, а сугуба індывідуальны, змястоўны,

непарыўна звязаны з чалавекам, рознымі аб'ектамі, прадметамі, пэўнымі падзеямі і з'явамі. Пры гэтым час «як агонь-рысак» вызначаецца рознымі вымярэннямі, якія не заўсёды ўкладваюцца ў межы традыцыйных яўленняў пра катэгорыю тэмпаральнасці. Розныя часавыя вымярэнні ў В. Зуёнка носяць індывідуальна-аўтарскі характар і напаўняюцца глыбокім ацэначным зместам за кошт прыцягнення ў паэтычны кантэкст прадметна-абстрактых намінацый.

Падзейныя маркеры часу часцей за ўсё ўключаюць тэмпаральны назоўнік *час* і субстантывы *кульба, лемех, невад, люстэрка, тлен, пясок, прадонне, невымернасць*: ***Кульба часу*** *топчаца па спіне; Іх [дарогі] круцяць крута* ***Часу лемяхі****, Каб прараслі Новыя шляхі; Нас у нязбытнасць –* ***часу невады*** *– За годам год – адносяць незваротна; Людзі прымерваюць вечнасць Перад* ***люстэркам часу****; Лячу ў* ***невымернасці часу****, А ў памяці досвед маю; Праз небыццё, праз* ***часу тлен****, – Гарыць на скронях сівізна; Што смяялася, што галасіла, – засыпае* ***часу пясок****; Якою замовай заклятым Той шлях у* ***часу прадонне****? Але ў* ***прадонні часу*** *знікла ўсё.*

Не менш запатрабаванымі з'яўляюцца канструкцыі з множналікавай формай назоўніка *год* і субстантывамі *скарынка, лемех, сноп, прасла, кросны, вір, завала: А час грызе, грызе* ***гадоў скарынку*** *– І мізарнее з кожным днём запас; Заворваюць памяць юнацтва* ***Гадоў лемяхі****; Складваю* ***снапы гадоў*** *тарпамі; Я руйнаваў* ***гадоў*** *мінулых* ***прасла****;* ***Гадоў*** *датканыя* ***кросны****: сплывае* ***сувой****, як вада; Сплылі* ***гадоў віры****; Гэта паэзія раптам* ***Завалу гадоў*** *узарве.*

У поле зроку В. Зуёнка трапляе і больш працяглы адрэзак часу – век, множная форма якога выкарыстоўваецца ў спалучэннях з субстантывамі *скрыжалі, скрыжаванне, наканаванне: І на* ***скрыжалі вякоў*** *нясём не пагрозы і звадкі, а мудрую памяць бацькоў; На* ***скрыжалях вякоў*** *не сцерці слоў, што вёска ўзрасціла мая; Стаю на* ***вякоў скрыжаванні****; Не тое і* ***вякоў наканаванне****.*

Успрыманне часу ў Васіля Зуёнка філасофскае, мудрае. Таму лірычны герой многіх твораў звяртае ўвагу на хуткаплыннасць часу, яго незваротнасць, непаўторнасць:

*У часе сваім ляціш –*
*Не вернешся і не пакінеш.*
*У часе сваім сядзіш,*
*Як птушанё ў шкарлупіне.*
*Мільгаюць: май, лістапад –*
*Язда ў нерухомым вагоне.*
*Няма вяртання назад,*
*І будучыню не дагоніш...*

Паэт асэнсоўвае час у непадзельным адзінстве з самім сабой і ўсімі тымі «нявечнымі», хто існуе «ў гэтай вечнасці»:

*За часам не вернешся наўздагон, –*
*Час – ён двайнік наш сустрэчны.*
*Час – гэта я, гэта ты, гэта ён,*
*А ўсё, што без нас, – гэта вечнасць…*

Тэмпаральныя метафары выражаюць рух і развіццё як універсальныя характарыстыкі асноў быцця. У гэтым няспынным і зменлівым руху вылучаюцца некалькі часавых цыклаў, звязаных з пачаткам развіцця, пэўным парадкам і паслядоўнасцю змен і, нарэшце, завершанасцю існавання. Паміж гэтымі цыкламі размяшчаюцца шматлікія этапы, якія выражаюць перыяды сталасці, росквіту, дасягнення пэўнай вяршыні, а таксама метафары са значэннем мінулага і будучага. Усе гэтыя цыклы не з'яўляюцца абстрагаванымі ад якіх-небудзь гістарычных падзей і грамадскага жыцця. Часцей за ўсё яны звязаны з экзістэнцыяй чалавека, яго мысленнем, светаўспрыманнем, з рознымі відамі духоўна-практычнай дзейнасці. У эпіцэнтры аўтарскага разважання звычайна знаходзяцца тры перыяды: мінулае, цяперашняе і будучае. *«Было, ёсць, будзе – тры часы Зліваюцца ў бязмежнасць»*, – справядліва зазначае паэт, для якога

*Час – мінулага памяць і тло,*
*Час – дзён існых двайнік пакутны,*
*А таго, што яшчэ не было,*
*Час не знае – ён там адсутны…*

Жыццё, як вядома, не стаіць на месцы. Яно знаходзіцца ў пастаянным руху, развіцці. І тое, што адбываецца зараз, цяпер, у долі секунды становіцца мінулым. Тое што прайшло, адбылося, захоўваецца ў памяці чалавека, якую многія лічаць адзіным вымярэннем часу. Адны і тыя ж падзеі і факты мінулага кожны чалавек прасейвае, як праз сіта, выбіраючы найбольш уражлівыя, запамінальныя. У такіх экзістэнцыяльна-тэмпаральных метафарах актуалізуюцца самыя разнастайныя праяўленні жыцця чалавека – кароткага імгнення, бліскавіцы, маленькай часцінкі бясконцага ў часе і прасторы сусвету.

У філасофіі, як вядома, пільная ўвага ўдзяляецца ўсім часавым інтэрвалам (секундам, мінутам, гадзінам, дням, тыдням, месяцам, гадам) безадносна да якіх-небудзь канкрэтных падзей і фактаў. Зуёнкаўскія кантэксты рэпрэзентуюць час з пункту гледжання яго працягласці, паслядоўнасці, змены часавых фаз і станаў, руху наогул. Міулыя дні і хвіліны вяртаюцца ва ўспамінах, у снах:

*Мінулых дзён мінулыя хвіліны,*
*Вы з небыцця на крылах успамінаў,*
*Як з выраю, вяртаецеся ў сны –*
*Аб тым, што так растрачана глумліва,*
*Засыпана бязмэтна часу млівам,*
*Размыта морам здрады і маны.*

У кантынууме ўспамінаў важнае месца займае час дзяцінства. І гэта не выпадкова. Сам В. Зуёнак ніколі не развітваўся з дзяцінствам, пра што сведчаць яго шматлікія творы для дзяцей (зборнікі «Жылі-былі пад вадой», «Сонечны клубочак», «Будзем сілы набірацца», «Шапка-ўсёвідзімка», «Хата, поўная гасцей», «Бадзірог» і інш.). Святло чароўнага дзяцінства дапамагае жыць чалавеку і ў яго сталым узросце: *Калі час да сценкі прыцісне, Спосаб ёсць пазбыцца жуды: Азірніцеся на дзяцінства – І глыніце жывой вады.*

Дзіцячыя ўспаміны, як зерні, што выраслі і зацвілі ў дарослым жыцці, ствараюць пазітыўны эмацыянальны настрой. Прыгадаем верш-медытацыю «Рэкі дзяцінства», у першых васьмі двухрадкоўях якога ў гранічна высокай, нават гіпербалічнай форме характарызуюцца рэаліі (рэкі, дрэвы, нівы, сцежкі, ночы, сны, крыўды, забавы), якія ў дзяцінстве былі спадарожнікамі лірычнага героя. Пры гэтым вышэйшая характалагічная ступень ствараецца за кошт выкарыстання займенніка *самы*:

*Рэкі дзяцінства –*
*Самыя глыбокія,*
*Дрэвы дзяцінства –*
*Самыя высокія.*
*Нівы дзяцінства –*
*Самыя шырокія,*
*Сцежкі дзяцінства –*
*Самыя далёкія.*
*Ночы дзяцінства –*
*Самыя кароткія,*
*Сны дзяцінства –*
*Самыя салодкія.*
*Крыўды дзяцінства –*
*Самыя слязлівыя,*
*Забавы дзяцінства –*
*Самыя смяшлівыя...*

Праўда, у другой частцы верша жыццясцвярджальны пафас зніжаецца за кошт выкарыстання дзеясловаў, якія «прызямляюць» дзіцячыя ілюзорныя ўяўленні і характарыстыкі: *рэкі мялеюць, дрэвы ніжэюць, нівы вузеюць, сцежкі карацеюць…*

У творчай скарбонцы Васіля Зуёнка шмат медыдатыўных і экзістэнцыяльных вершаў, змест якіх скіраваны на паглыблены роздум, усведамленне і выяўленне глыбінных заканамернасцяў і духоўных асноў быцця, Часцей за ўсё ў вершах – філасофскія разважанні пра жыццё і смерць, зямное прызначэнне чалавека, яго месца ў светабудове і непарыўныя сувязі з навакольным светам. Як маленькая часцінка бясконцага ў часе і прасторы сусвету, паэт імкнецца адказаць на самыя галоўныя пытанні існасці: *«На скрыжаваннях сусвету хто мы і колькі нас? Пылінка. Малая пры гэтым. Драбок галактычных мас»*, – разважае В. Зуёнак і дае сцвярджальны адказ: *«Я – космас і пылінка. І між намі – Адзін агонь. Як вечнасці уток»*. Аўтарэфлексія, аналіз уласнага псіхічнага стану, адказы на пытанні аб сваім прызначэнні і месцы ў бясконцай прасторы – найбольш частыя запаўняльнікі паэтычнага дыскурса В. Зуёнка: *Я часцінка і космас – Я загадкай іду. Я прамы, а не ўскосны Шлях да боскіх задум; А я – ніхто: адзінка, чалавек, І ў твар смяецца мне абманны век.*

Да ліку нетрадыцыйных неабходна аднесці атаясамліванні «я» з акіянам асверу, апошнім рэхам, нашчадкам мёртвых азёр: *А я –* ***асверу акіян*** *вяслом нязбытнасці папкутнай; Я* ***нашчадак*** *мёртвых* ***азёр****.*

Аўтаметафара «я» часам выкарыстоўваецца для асэнсавання свайго мастацкага крэда, паэтычнага светапогляду: *Я не выбраннік – я крыло Рукою замяніў пачварнай І ў зрэнкі, як у жарало, Штодня ссыпаю плён базарны; Мне вечна юным быць аратым, Бо ўсіх пачаткаў я – працяг І ўсіх працягаў я – пачатак; Дзе ты, песня? Маўчыць, не прыходзіць…. Я – той песні апошняе рэха.*

У многіх радках адчуваюцца пульс і глыбіня складанага чалавечага жыцця, непарыўная сувязь лірычнага героя з кожнай часцінкай сусвету, яго трывога, наканаванасць і адказнасць за лёс людзей.

*Прарастаю трывогамі,*
*Як зямля каранямі,*
*Як імкненне – дарогамі,*
*Як цемень – агнямі.*
*Узыходжу чаканнем,*
*Як вечнасць, бясконцым,*
*Як травінка праз камень:*
*Без сонца – да сонца.*
*Узлятаю надзеямі,*
*Як жаўранак весні.*
*Толькі дзе яны, дзе яны –*
*Поля жніўнага песні?*

Шырокі семантычны дыяпазон назіраецца ў дэфініцыях да слова *жыццё*, якое можа атаясамлівацца з практычна з неабмежаванай колькасцю з'яў і рэалій навакольнай рэчаіснасці. У гэтых выпадках феномен быцця ўкладваецца ў межы прэдыкатыўнай інварыянтнай мадэлі *«жыццё → гэта...»*, у якой экзістэнцыяльны субстантыў *жыццё*, не адносячыся да паняццяў эмпірычнага ўзроўню рэальнасці, атрымлівае рэальнае ўвасабленне ў выглядзе розных намінацый: *жыццё гэта загадка, непаўторнасць, непазбежнасць, іспыт, латарэя, адмашка вечнасці, шлях у небыццё, пытанне на крыжах дарог, малітва небу і зямлі…* У паэтычных кантэкстах часта прыводзіцца агульнавядомая думка аб кароткачасовасці жыцця: *Жыццё кароткае, як сон Кароткай чэрвеньскаю ноччу; Жыццё пражыта – як і не было: Ні горкіх слёз, ні радасці, ні песень.* Нагадаем некалькі прыкладаў, дзе жыццёвая дарога прадстаўлена рознымі маркерамі і семантычнымі вымярэннямі, якія «схаваны» ў глыбінных структурах лексічных адзінак:

*Жыццё – і развітанне і абман:*
*Імгла ў былым і ў прышласці туман.*

*Жыццё – пытанне на крыжах дарог:*
*Накрэсліў лёс, ды разгадаць не змог.*

*Жыццё – малітва небу і зямлі,*
*Што міг бяссмерця і табе далі…*

*І жыццё – нібы зала чакання…*
*Тчом сцежку жыцця знядужана,*
*Выбельваем на вятрах.*
*А вынік? – сатканага кужалю*
*Ці будзе прыкрыць хоць прах?..*

*Жыццё не старэе –*
*Жыццё застаецца жыццём.*
*Жыццё – латарэя,*
*А выйгрыш адзін – небыццё.*

Не засталося па-за ўвагай паэта акрэсліванне смерці, яе загадкавасці і раптоўнасці, непазбежнасці. Намінацыі, звязаныя з паняццем смерці, утвараюцца па той жа семантычнай мадэлі *«смерць → гэта…»*: *Смерць – гэта і ёсць вечнасць. Ды яшчэ й скупая; А смерць – толькі час і прастора, Якіх мы баімся панічна; Можа, і смерць чалавека – Скалапсаваная зорка?*

У асобных выпадках паняцці жыцця і смерці разглядаюцца як адзіныя часткі экзістэнцыяльнага працэсу, якія могуць атаясамлівацца: *Жыццё і смерць, – як спарышы Ў палёце незваротным; Жыцця і смерці крэўнасць спрадвечная Нам Усявышнім наканавана; Толькі смерцю ачалавечана Будзе жыццё тваё – позна ці рана; Ядро геніяльных збліжэнняў: «Жыццё і смерць»*.

У паэтычных фрагментах часам выкарыстоўваецца прыём проціпастаўлення жыцця і смерці. Апазіцыя *жыццё – смерць*, якую называюць канцэптуальнай дыядай, стварае яркі антытэзны, канстрастны малюнак, у якім кадзіруюцца розныя вобразы і атаясамліванні. Антонімы *жыццё – смерць* як бы падзяляюць семантычную прастору на дзве часткі, маркіраваныя станоўчымі і адмоўнымі знакамі. Як правіла, да кожнага з такіх паняццяў прыводзяцца вобразныя выразы і азначэнні, якія адлюстроўваюць розныя сутнасці жыцця і смерці чалавека: *Жыццё такое доўгае, А смерць – адно імгненне; Шлях у нас: Прамы, Дзе нараджэнне і смерць – Дзве супярэчнасці; Праўдзівы жыццём, а смерцю ілжывы Наш век чалавечы на гэтай зямлі; Смерць не ведае пакут, А жыццё – надзей; Жыццём зарабіў на транзітны білет, А смерць – толькі спосаб транспарціроўкі.*

Змест экзістэнцыяльных намінацый уключае не толькі канстатацыю жыццядзейнасці чалавека, але і асаблівасці ўспрымання, разумення і ацэньвання розных аспектаў быцця чалавека. Таму ў зуёнкаўскі паэтычны дыскурс уключаюцца ментальныя метафарычныя намінацыі з субстантывам *думка*: *Гайдаецца* ***думак човен****, з палёў у хату вяртае – да кніжак вунь тых вучоных, што ў прыцемку дочкі чытаюць; Маўчанне –* ***дум*** *нязведаных* ***зачын****, – Іх у сусвет пашлём маўчання поштай; У пустамоўнасці застольнай* ***засекі дум*** *не спаражні; Між двух берагоў вясёлая кладка, Праменьчык, што* ***думкі*** *злучае; Толькі сон мой штоноч ірвецца* ***Дум зярняты*** *перасыпаць.*

У кампазіцыйны рэпертуар Васіля Зуёнка часта ўключаюцца шматкампанентныя структуры, у якіх шляхам параўнанняў, атаясамліванняў і пераўвасабленняў пашыраецца сэнсавы аб'ём выказвання, падкрэсліваюцца і вылучаюцца найбольш важныя элементы кантэксту: *Узнацкі шлях:* ***вязьмо*** *маіх дарог,* ***вязьмо надзей, чаканняў і трывог****; Чалавек – гэта літара космасу, іерогліф, таемны знак; Я* ***сын****, я* ***сэнс****, я* ***дух*** *жывы прыроды, астатняе – вучонасці сіндром; Вось вам* ***радкі і строфы, смутак, жаль, Мае грахі, і думы, і надзеі****… А перад намі – торжышча мяжа Вужакай залатою халадзее.*

Такім чынам, у паэтычным дыскурсе Васіля Зуёнка адлюстроўваюцца самыя разнастайныя грані і нюансы катэгорый тэмпаральнасці і экзістэнцыяльнасці. Рэпрэзентацыя шматлікіх аспектаў тэмпаральнага і экзістэнцыяльнага кантынуумаў з'яўляецца вызначальнай рысай самабытнага і непаўторнага аўтарскага стылю В. Зуёнка, важным сродкам вобразнага адлюстравання і пазнання свету.

На фоне ўсіх экзістэнцыяльных намінацый вылучаецца група філасофскага кірунку, дзе сімвалізуецца жыццёвы шлях чалавека, яго лёс і прызначэнне, роля ў жыцці грамадства. В. Зуёнак уздымае пытанні аб вымярэннях жыцця і смерці, іх часавых і прасторавых суадносінах, а таксама кантэкстава-семантычных атаясамліваннях і проціпастаўленнях.

У эпіцэнтры зуёнкаўскіх разважанняў – чалавек, яго месца ў светабудове і непарыўныя сувязі з навакольным светам. У такіх разважаннях адчуваюцца пульс жыцця, хада вечнага і ў той жа час імгненнага часу, лучнасць усяго жывога і нежывога, непарыўныя сувязі чалавека з кожнай часцінкай зямнога быцця ў бясконцым у часе і прасторы сусвеце. Для выяўлення часу, спецыфіка ўспрымання якога заўсёды была важным кампанентам усёй дзейнасці чалавека, аўтар выкарыстоўвае кантэксты з прадметнымі і абстрактнымі намінацыямі (*кульба, прасла, лемех, кросны, невад, скарынка, прадонне, тлен, скрыжалі*). Змест тэмпаральных метафар, якія выражаюць рух і развіццё як універсальныя характарыстыкі асноў быцця, акрэсліваюцца пэўным парадкам, накіраванасцю ад мінулага да будучага. У гэтым няспынным і зменлівым руху аўтар з асаблівай цеплынёй вылучае перыяд дзяцінства, якое дае аснову для загартоўкі чалавека, яго будучай дзейнасці.


Літаратура

1. *Заяц, Н.* «Мы заўжды на пачатку дарог…»: штрыхі да творчага партрэта Васіля Зуёнка / Н. Заяц // Роднае слова. – 2010. – № 6. – С. 12–15.
2. *Заяц, Н.* Часавыя вымярэнні паэзіі Васіля Зуёнка / Н. Заяц // Маладосць. – 2016. – № 3. – С. 135–137.
3. *Гніламёдаў, У. В.* Праўда зерня : творчы партрэт В. Зуёнка / У. Гніламёдаў. – Мінск : Маст. літ., 1992. – 143 с.
4. *Гніламёдаў, У.* «І ўсіх працягаў я – пачатак»: паэтычны эпас Васіля Зуёнка «Пяцірэчча» / У. Гніламёдаў // Роднае слова. – 1995. – № 6. – С. 8–21.
5. *Барадулін, Р.* Недзе слова шукае мяне... / Р. Барадулін // Маладосць. – 1995. – № 6. – С. 232–239.

References

1. *Zayac, N.* «My zaŭzhdy na pachatku darog…»: shtryhi da tvorchaga partreta Vasilya Zuyonka / N. Zayac // Rodnae slova. – 2010. – № 6. – S. 12–15.
2. *Zayac, N.* Chasavyya vymyarenni paezii Vasilya Zuyonka / N. Zayac // Maladosc'. – 2016. – № 3. – S. 135–137.
3. *Gnilamyodaй, U. V.* Praŭda zernya : tvorchy partret V. Zuyonka / U. Gnilamyodaŭ. – Minsk : Mast. lit., 1992. – 143 s.
4. *Gnilamyodaй, U.* «I ŭsih pracyagaŭ ya – pachatak»: paetychny epas Vasilya Zuyonka «Pyacirechcha» / U. Gnilamyodaŭ // Rodnae slova. – 1995. – № 6. – S. 8–21.
5. *Baradulin, R.* Nedze slova shukae myane... / R. Baradulin // Maladosc'. – 1995. – № 6. – S. 232–239.